**Ліхараў І.І.**

# ПАДРЫХТОЎКА БІБЛІЯТЭКАРАЎ СЯРЭДНЯЙ КВАЛІФІКАЦЫІ Ў БССР У ПАСЛЯВАЕННЫ ЧАС (1944–1961 гг.)

Як сведчыць галіновая статыстыка, сярэднюю бібліятэчную адукацыю маюць 40% работнікаў публічных бібліятэк [8]. Базавай установай адукацыі па падрыхтоўцы спецыялістаў бібліятэчна-інфармацыйнай сферы сярэдняга звяна з'уляецца Магілеўскі дзяржаўны бібліятэчны каледж імя А.С.Пушкіна. Як і любая навучальная ўстанова, каледж знаходзіцца ў пастаяным пошуку кропак росту і шляхоў абнаўлення адукацыі, што актуалізуе пытанне аналізу не толькі сенняшняга стану адукацыйнага працэсу, але і зварот да гісторыі.

Гісторыя развіцця бібліятэчнай адукацыі на Беларусі знайшла сваё адлюстраванне ў шэрагу прац, у тым ліку, такіх навукоўцаў як Н.В Алянюк [5], М.І. Пакала [6], І.Б. Сіманоўскага [7] і інш. У большасці выпадкаў пры аналізе праблем бібліятэчнай адукацыі разглядаецца падрыхтоўка спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі; адсутнічае грунтоўны аналіз дынамікі зместу сярэдняй бібліятэчнай адукацыі.

У 1944 г. на базе Рэспубліканскага культасветвучылішча была адноўлена дзейнасць дзеннага бібліятэчнага адзялення, а годам пазней - завочнага.

У 1945 г. Старшыня Камітэта па справах культурна-асветных устаноў пры СНК БССР П.Лютаровіч накіроўвае ў рэспубліканскі ўрад ліст, у якім адзначалася: "…у большасці бібліятэк рэспублікі працуюць малападрыхтаваныя таварышы, якія не ўмеюць апрацаваць кнігу па правілах бібліятэчнай тэхнікі, наладзіць неабходнага ўліку і справаздазнасці, улічыць запыты чытача. Для ўсей сеткі бібліятэк у цяперашні час неабходна каля двух тысяч бібліятэкараў сярэдняй кваліфікацыі, у наступныя гады гэта патрэбнасць будзе яшчэ болей узрастаць." [4, Воп. 3. Спр.104. Л. 164].

Неабходнасць базіравання тэхнікума ў сталіцы Савецкай Беларусі тлумачылася наўнасцю "дастатковай колькасці высакакваліфікаваных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выкладчыцкіх кадраў". [4, Воп. 3. Спр. 104. Л. 164]

Вынікім разгляду дакладной запіскі стала ўрадавае рашэнне ад адкрыцці ў 1946 г. рэспубліканскага бібліятэчнага тэхнікума ў Мінску [4, Воп. 3. Спр. 79. Л. 197].

У адпаведнасці з Наменклатурай пасад бібліятэчных работнікаў асобы с сярэдняй спецыяльнай адукацыяй маглі прэтэндаваць на замяшчэнне наступных пасад: загадчык структурнага падраздялення бібліятэкі (у выключных выпадках), бібліятэкар, бібліёграф [3, Воп.1. Спр. 12. Л. 58].

Трэба дадаць, што тым жа нарматыўным актам прадугледжаваліся пасады памочніка бібліятэкара (для асоб з сярэдняй адукацыяй) і бібліятэчнага тэхніка (для асоб з сямігадовай адукацыяй) [3, Воп.1. Спр.12. Л.58].

Хранічнай праблемай бібліятэчных тэхнікумаў СССР, у тым ліку і Мінскага, была дрэнная матэрыяльна-тэхнічная база. Менавіта з гэтым звязаны пераезды тэхнікума ў 1946 г. у Магілеў, 1948 г. – Мінск, у 1961 г. – зноў у Магілеў [1].

У 1950 г. у мэтах "паляпшэння справы падрыхтоўкі бібліятэчных кадраў усіх ведамстваў і арганізацый рэспублікі" пры тэхнікуме адкрыта завочнае аддзяленне [4, Воп. 3. Спр. 483. Л. 342].

Вывучэнне перапіскі тэхнікума з вышэйстаячымі партыйнымі і дзяржаўнымі органамі і вучэбна-метадычнай дакументацыі дазваляе вылучыць характэрныя рысы арганізацыі навучальнага працэсу таго часу.

Па-першае, жорсткая цэнтралізацыя кіраўніцтва навучальнай установай і права вышэйстаячых органаў на аператыўнае ўмяшальніцтва непасрэдна ў падрыхтоўку кадраў. У 40-50 гг. XX ст. прызначэнне і звальненне педагагічных работнікаў ў першыя гады афармлялася загадам старшыні камітэта па справах культуна-асветніцкіх устаноў пры СНК БССР.

Пытанні развіцця бібліятэчнага тэхнікума неаднаразова разглядаліся на калегіях камітэта па справах культурна-асветніцкіх устаноў. Так, па выніках калегіі 1951 г. планавалася рэалізацыя шэрагу мер па ўдасканаленні вучэбна-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выхаваўчага працэса тэхнікума: стварэнне гуртка бібліяграфіі, перавод двух высакакваліфікаваных супрацоўнікаў Дзяржбібліятэкі імя У.І.Леніна БССР на пасады выкладчыкаў спецыяльных дысцыплін, выкарыстанне спецыялістаў, якія прыязджалі на бібліятэчны факультэт Мінскага педагагічнага інстытута чытаць лекцыіі, для павышэння кваліфікацыіі выкладчыкаў спецыяльных дысцыплін і інш. [3, Воп. 1. Спр. 134. Л. 24-25] А студзенская калегія саюзнага Камітэта па справах КАУ 1952 г. на падставе вывучэння дзейнасці шэрагу бібліятэчных тэхнікумаў, адзначыла, што "галоўная задача бібліятэчнага тэхнікума – рыхтаваць спецыялістаў бібліятэчнай справы, узброеных ведамі асноў марксізма-ленінізма, агульнаадукацыйных дысцыплін, а таксама веданнем кніг, зместа і метадаў біблятэчнай работы і ўменнем выкарыстоўваць гэтыя веды ў практычнай рабоце масавай бібліятэкі" [3, Воп. 1. Спр. 144. Л. 25-26].

Саюзныя і рэспубліканскія органы кіравання актыўна карысталіся правам праверкі стану арганізацыі навучальнага працэсу ў сярэдніх спецыяльных навучальных установах, у тым ліку і бібліятэчнага тэхнікума. Так, пад час праверкі Мінвуза СССР, што адбылася ў 1954 г., былі адменены вынікі вясенняй экзаменацыйнай сесіі ў сувязі з выяўленнем "недазволеных вучэбных матэрыялаў" [1].

Па другое, у дадзены перыяд назіраецца паступовая змена тэрмінаў навучання. У першыя пасляваенныя гады ва ўмовах крытычнага недахопу працоўных рэсурсаў ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі – падрыхтоўка бібліятэкараў адбывалася па гадзічнай праграме, у 1953 г. бібліятэчныя тэхнікумы СССР перайшлі на паўтарагадовы тэрмін навучання на базе дзесяці класаў, а з 1957 г. – на звыклыя два гады навучання [7, с. 25].

Па-трэцяе, у гэты перыяд былі закладзены прынцыповыя асновы зместу падрыхтоўкі бібліятэчных кадраў сярэдняга звяна, а менавіта: вылучэнне трох базавых дысцыплін – "Бібліятэказнаўства", "Бібліяграфія", "Арганізацыя бібліятэчных фондаў і каталогаў"; моцная літаратурная падрыхтоўка – гэта блок дысцыплін "Русская (сусветная) літаратура",

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

“Беларуская літаратура”, “Дзіцячая літаратура”; вывучэнне асноў бібліятэчна-клубнай работы. Гэтыя асновы актуальныя і сення.

Па-чацвертае, у 1950-ыя гады ўпершыню былі зроблены спробы інтэграцыі вышэйшай і сярэдняй бібліятэчнай школы – некалькі разоў адбываўся набор у спецыяльную групу на базе агульнай сярэдняй адукацыі, выпускнікі якой маглі на ільготных умовах паступаць на бібліятэчны факультэт Мінскага педагагічнага інстытута.

За перыяд з 1948 г., калі адбыўся першы выпуск бібліятэчных работнікаў, і да 1961 г. у бібліятэчным тэхнікуме былі падрыхтаваны каля 1500 спецыялістаў [1]. Дарэчы, ў той час тэхнікум быў даволі прываблівым для абітурыентаў, бо конкурс у навучальную ўстанову быў ні ніжэй за конкурс на гістфак БДУ.

У гэты час азы бібліятэчнай прафессіі засвойвалі будучыя яскравыя пісьменнікі і літаратуразнаўцы: Аляксей Каўка, заслужаны работнік культуры Беларускай ССР Алесь Махнач (удзельнік абароны Брэскай крэпасці), Аляксей Чаркасаў, Рыгор Юркевіч, былі такія і сярод выкладчыкаў – напрыклад, прафесар Сцяпан Александровіч. Сярод выпуснікоў і тэатралы – гэта заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь Тамара Шашкіна.

Такім чынам, можна сцярджаць, што для этапа пасляваеннага аднаўлення падрыхтоўкі бібліятэчных работнікаў сярэдняга звяна характэрны наступныя рысы: стварэнне профільнай ССНУ – бібліятэчнага тэхнікума (адкрыцце якога планавалася яшчэ ў 1935 г.) і пільная ўвага да яго развіцця з боку цэнтральных органаў кіравання; павялічэнне тэрмінаў навучання з аднаго года да двух; фарміраванне прынцыповых асноў зместу падрыхтоўкі спецыялістаў; першапачатковыя спробы інтэграцыі вышэйшай і сярэдняй бібліятэчнай школы.

---

1. Архіў установы адукацыі "Магілеўскі дзяржаўны бібліятэчны каледж імя А.С.Пушкіна".

2. Дзяржаўны архіў Магілеўскай вобласці. Ф.1848. Магілеўскі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бібліятэчны тэхнікум імя А.С.Пушкіна.

3. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 790. Камітэт па справах культурна-асветніцкіх устаноў пры Савеце Народных камісараў Беларускай ССР.

4. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Фонд 7. Савет Народных камісараў БССР.

5. Олянюк, Н. В. Подготовка и повышение квалификации библиотечных кадров в БССР : история, современное состояние и перспективы : автореф. дис. на соиск. учен. степ. канд. пед. наук : 05.25.03 / Олянюк Н. В.; Моск. гос. ин-т культуры. – М., 1991. – 16 с.

6. Покало, М. И. История библиотечного дела в БССР / М. И. Покало. – Мн. : Выш.школа, 1986. – 198 с.

7. Симановский, И. Б. Развитие библиотечного дела в БССР, его итоги и перспективы к 40-летию Великой Октябрьской социалистической революции / И. Б. Симановский // 40 лет библиотечного строительства в СССР: доклады научной конференции, 23–26 декабря 1957г. – М., 1958. – С. 191–286.

8. Публичные библиотеки: статистика // Интернет-портал Национальной библиотеки Беларуси. – Режим доступа : http://www.nlb.by/portal/page/portal /index/content?lang=ru&classId= D8CEF5DCE78944069024A43C379192C0. – Дата доступа : 01.03.2013.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ